АБ ДАЛЕЙШЫМ УДАСКАНАЛЕННІ РАБОТЫ З ПІСЬМАМІ І ПАЛЯПШЭННІ ПРЫЁМУ ПРАЦОЎНЫХ У ПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКІХ І ІНШЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ РЭСПУБЛІКІ

Даклад другога сакратара ЦК КП Беларусі таварыша У. І. БРОВІКАВА

Таварышы!

Гэты пленум ЦК Кампартыі Беларусі стане важнай вяхой у рабоце рэспубліканскай партыйнай арганізацыі па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС. Пленум вызначыў задачы адносна адной з карэнных праблем камуністычнага будаўніцтва — праблемы развіцця навукі як непасрэднай прадукцыйнай сілы.

Даклад П. М. Машэрава, выступленні ў спрэчках, прынятая ўчора рэзалюцыя развіваюць і канкрэтызуюць у дастасаванні да ўмоў рэспублікі прынцыповыя ўстаноўкі партыі, ідэі і палажэнні Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева па гэтаму буйному, праграмнага значэння пытанню.

Цяпер усе мы больш ясна ўяўляем, што і як трэба рабіць, каб забяспечваць далейшае павышэнне эфектыўнасці фундаментальных і прыкладных даследаванняў, каб навука ўсё мацней уздзейнічала на ўдасканаленне матэрыяльнай вытворчасці, грамадскіх адносін і духоўнага жыцця рэспублікі.

Мы спадзяёмся, што слаўны атрад вучоных Савецкай Беларусі, нашы працоўныя калектывы, партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі прымуць блізка да сэрца ўсё, што намечана пленумам, і на аснове паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу павялічаць уклад рэспублікі ва ўмацаванне эканамічнай і абароннай магутнасці краіны.

Цяпер, таварышы, дазвольце выказаці пазіцыі Бюро ЦК па другому пытанню парадку дня.

КПСС заўсёды лічыла і лічыць сваім святым і найвышэйшым абавязкам усямернае ўмацаванне сувязей з народам, паглыбленне дэмакратызму ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, шырокае ўцягненне працоўных у кіраванне дзяржавай. І, калі на ўсіх этапах наша партыя, Савецкая ўлада паспяхова вырашылі самыя складаныя, наватарскія па сваёй сутнасці і сусветна-гістарычныя па сваёй значнасці задачы, то гэта галоўным чынам таму, што яны, кіруючыся ленінскімі запаветамі, нязменна дабіваліся, каб масы ўсё ведалі, аб усім маглі меркаваць, на ўсё ішлі свядома.

Сіла Камуністычнай партыі ў тым і заключаецца, што яна заўсёды і ва ўсім кіруецца карэннымі інтарэсамі працоўных, уважліва вывучае і з максімальнай паўнатой улічвае настрої мас, іх думку і вопыт пры выпрацоўцы і правядзенні свайго палітычнага курсу як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне.

жавы, поспехі ў ажыццяўленні сацыяльна-эканамічнай праграмы партыі, рост самадзейнасці савецкіх людзей як сапраўдных гаспадароў краіны.

Характэрная асаблівасць развіцця грамадскіх адносін на этапе сталага сацыялізму заключаецца ва ўсё больш цесным спалучэнні палітыкі Камуністычнай партыі з жывой творчасцю шматмільённых мас. Гэта асаблівасць праяўляецца ва ўсёй сваёй велізарнай разнастайнасці, у тым ліку ў высокай грамадзянскасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі савецкага чалавека, якому ёсць справа да ўсяго, што адбываецца ў грамадстве і дзяржаве.

Вось чаму партыя лічыць, што сёння трэба яшчэ з большай чуласцю прыслухоўвацца да думак і настрою людзей, не толькі вучыць масы, як лепш змагацца за камуністычныя ідэалы, але і вучыцца ў іх, пастаянна ўзбагачаць іх калектыўнай мудрасцю.

Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў рашэннях XXV з'езда партыі і новай Савецкай Канстытуцыі. Гэта чырвонай ніткай праходзіць праз вядомыя пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні работы з пісьмамі працоўных у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС» (1976 г.) і «Аб далейшым паляпшэнні прыёму грамадзян у партыйных, савецкіх і іншых арганізацыях» (1979 г.).

Мэта і галоўны сэнс намаганняў партыі ў гэтым напрамку — забяспечыць, як указвае Л. І. Брэжнеў, — каб «...кожны савецкі чалавек мог адчуць сваё дачыненне да дзяржаўных спраў, быў упэўнены ў тым, што яго думка, яго голас будуць пачуты і ўлічаны пры выпрацоўцы вялікіх і малых рашэнняў».

Трэба далажыць пленуму, што з мэтай выканання названых рашэнняў і ўказанняў КПСС ЦК, абкомы, гаркомы, райкомы і первічныя арганізацыі Кампартыі Беларусі праводзяць вялікую і рознабаковую работу. Зроблены канкрэтныя крокі да істотнага паляпшэння разгляду пісьмаў і арганізацыі прыёму грамадзян як важнага сродку развіцця сувязей з масамі, узмацнення кантролю знізу за дзейнасцю кіруючых кадраў і апарату, вывучэння і ўсё больш поўнага задавальнення патрэб і запатрабаванняў савецкіх людзей.

Гэтыя пытанні ўсебакова і грунтоўна абмеркаваны ў Бюро ЦК, на пленумах абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, практычна ва ўсіх нізавых партыйных звенях. Аб-

Такой мерай Цэнтральны Камітэт як бы яшчэ раз на справе паказвае, што работа з пісьмовымі і вуснымі заявамі савецкіх людзей — гэта не толькі справа апарату, але і ўсіх без выключэння кіраўнікоў рэспублікі.

Паступаючыя ў ЦК пісьмы і вусныя заявы нярэдка становяцца прычынай і жывой асновай для прыняцця важных, як бягучага, так і доўгатэрміновага характару, рашэнняў. Толькі за пасляз'ездаўскі перыяд у бюро і сакратарыяце Цэнтральнага Камітэта разгледжана звыш 50 пытанняў, якія непасрэдна вынікаюць з пісьмаў працоўных.

І гэта прынцыпова важна. Гэта ўзнімае работу з пісьмамі да ўзроўню партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва, садзейнічае практычнаму ўвасабленню ленінскага запавета аб неабходнасці «абавязкова прывучыць насельніцтва да таго, што слушныя скаргі маюць сур'ёзнае значэнне і прыводзяць да сур'ёзных вынікаў» (т. 50, стар. 224).

ЦК КПБ з усёй настойлівасцю, паслядоўна дабіваецца, каб на ўсіх узроўнях партыйнага, дзяржаўнага і гаспадарчага кіраўніцтва гэты выключна адказны ўчастак работы быў узняты да вышыні сучасных патрабаванняў, прад'яўляе ў гэтым плане строгасць і патрабавальнасць да кадраў.

У ходзе падрыхтоўкі да цяперашняга пленума была арганізавана праверка таго, наколькі адпавядае гэтым патрабаванням дзейнасць партыйных камітэтаў, міністэрстваў і ведамстваў, савецкіх органаў і грамадскіх арганізацый. Вынікі разгледжаны ў Бюро ЦК, Прэзідыуме Вярхоўнага Савета і ўрадзе рэспублікі, зроблены неабходныя вывады.

Аналіз сабранай інфармацыі паказвае, што ўважлівы разгляд і своечасовая рэалізацыя прапаноў, крытычных заўваг і просьбаў, выстаўляемых у пісьмах і ў час асабістага прыёму грамадзян, для многіх кіруючых органаў у цэнтры і на месцах сталі важнейшай палітычнай справай, прадметам асаблівых клопатаў.

Больш насычанай па зместу і разнастайнай па метадах становіцца палітычная, арганізатарская і выхаваўчая работа, што праводзіцца ў гэтым плане абласнымі, гарадскімі і раённымі камітэтамі партыі. Іх бюро, сакратары і апарат цяпер больш пільна сочаць за тым, дзе і якім чынам пастаўлена справа, як у тых або іншых

прапановы і просьбы грамадзян. Ён практычна штодзённа прымае наведвальнікаў і, акрамя гэтага, два дні ў месяц спецыяльна прысвячае гэтай справе. Зусім натуральна, што ў Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння ў цэлым работа з пісьмамі і прыёмам грамадзян пастаянна ўдасканальваецца.

Карыстаючыся выпадкам, хацеў бы падкрэсліць выключную важнасць таго факта, што разборам пісьмаў і звязаней з імі работай, непасрэдна прыёмам грамадзян займаюцца кіраўнікі, так сказаць, першага рангу.

Цеснымі вузамі, тысячамі нітей звязаны з масамі, з іх штодзённымі справамі і клопатамі органы Савецкай улады на месцах. Сюды накіроўваецца велізарны паток пісьмаў, заяў, просьбаў, скаргаў працоўных, сюды ідуць людзі, каб у асабістай гутарцы з кіруючымі і адказнымі работнікамі Савецкай вырашыць вялікае або малое, але ва ўсіх выпадках важнае для свайго жыцця пытанне. І дзеля справядлівасці трэба сказаць, што мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, іх выканкомы ўсё лепш і лепш вядуць гэту велізарную дзяржаўнага значэння работу.

У якасці пацвярджэння сказанага можна было б спаслацца толькі на адзін са шматлікіх прыкладаў — вопыт выканаўчага камітэта Крычаўскага раённага Савета. Тут склалася і дзейнічае дакладная сістэма вывучэння, усебаковага аналізу і разгляду паступаючых ад насельніцтва пісьмаў, са зместам абсалютнай большасці якіх асабіста знаёміцца старшыня выканкома тав. Полькіна З. І. Калі высвятляецца, што ўзнятае пытанне актуальнае, закранае не толькі асабістыя, але і агульныя інтарэсы, то выканком імкнецца задаволіць і тыя і другія.

Іменна такога характару пісьмы паслужылі штуршком для прыняцця рашэння выканкома аб удасканаленні бытавога абслугоўвання жыхароў раёна, аб паляпшэнні забеспячэння сельскага насельніцтва хлебабулачнымі вырабамі, аб парушэннях зямельнага заканадаўства ў калгасе «Ударнік» і многіх іншых. Прыёмам грамадзян тут у адпаведнасці з графікам штодзённа заняты старшыня, намеснікі старшыні і сакратар выканкома. І што асабліва важна, выканком з усёй строгасцю і прынцыповасцю, уважліва і пастаянна ажыццяўляе праверку фактычнага выканання прымаемых рашэнняў, рэалізацыі прапаноў, просьбаў і заўваг працоўных.

Само сабой зразумела, што пагаварыць з чалавекам больш прыемна, чым з тэхнічнай канструкцыяй. Разам з тым нам здаецца, што прымяненне дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу і ў гэтай галіне зусім не выключаецца.

Таварышы!

Усё сказанае, а таксама іншая шырокая інфармацыя, якую мае Бюро ЦК, сведчаць аб тым, што ў рэспубліцы ў цэлым праводзіцца шматпланавая работа, звязаная з абмяркоўваемым пытаннем.

І ўсё-такі ў нас няма ніякага права быць задаволенымі, бо на гэтым важнейшым участку партыйнай і дзяржаўнай работы есць яшчэ нямала непрыемных недахопаў, а часам і памылак і грубых парушэнняў. Мы яшчэ нярэдка сустракаемся з фактамі, калі асобныя кіруючыя органы і кадры аказваюцца не на ўзроўні, праяўляюць неразуменне значэння гэтай справы, фармальныя да яе адносіны.

У асноўным гэтым растлумачваюцца маючыя месца выпадкі, раўнадушнага, нядбайлівага, карацей, фармальна-бюракратычнага падыходу да сігналаў, жыццёвых інтарэсаў і запатрабаванняў працоўных, да іх прапаноў і крытычных заўваг.

Пісьмы працоўных, вусныя заявы грамадзян з'яўляюцца для нас не толькі чуткім барометрам грамадскай думкі, але і каштоўнейшай крыніцай інфармацыі аб тым, якое становішча спраў ва ўсіх сферах эканамічнага і культурнага жыцця, на ўсіх участках партыйнай, савецкай і гаспадарчай работы, аб тым, што ў нас выходзіць і што яшчэ пакуль не атрымліваецца, аб тым, як працуюць і наколькі адпавядаюць сучасным патрабаванням нашы кадры.

І калі мы хочам паспяхова кіраваць, ажыццяўляць правільнае кіраўніцтва ўсімі бакамі жыцця, чула рэагаваць на настроі і запатрабаванні мас, то павінны з максімальнай паўнатой выкарыстоўваць усю гэту найбагацейшую інфармацыю.

Чаму вучыць нас аналіз пісьмаў і вусных зваротаў грамадзян?

Усім вядома, наколькі вялікія маштабы жыллёвага будаўніцтва ў рэспубліцы. Толькі за апошнія тры гады ў нас уведзена ў строй 12,5 мільёна квадратных метраў жылой плошчы, што дало магчымасць палепшыць жыллёвыя ўмовы аднаму мільёну 150 тысячам людзей.

Усё гэта вынік нястомных

указана на недапушчальнасць такіх фактаў, а т. Дубовік Э. П. вызвалены ад займаемай пасады. І гэта справядліва. Мы не можам і не павінны дараваць такіх дзеянняў нікому. Людзям з халодным сэрцам, глухім да запатрабаванняў савецкага чалавека няма і не павінна быць месца ў партыйным і дзяржаўным апараце.

На наша здзіўленне і вялікае засмучэнне, з няўважлівымі, а часам і бяздушнымі адносінамі да просьбаў удзельнікаў вайны прыходзіцца сутыкацца нават у тых выпадках, калі гутарка ідзе аб больш простых, лёгка вырашальных пытаннях.

Падумайце, таварышы, самі. Інваліду вайны II-й групы т. Кротаву з саўгаса «Бацвінава» Чачэрскага раёна, каб атрымаць машыну для дастаўкі дроў, запатрабавалася прыехаць у ЦК КПБ, бо дырэктар саўгаса т. Дамасканаў на працягу паўгода адмахваўся ад належэка і яго клопатаў. Вось жа, аказваецца, есць яшчэ якія кіраўнікі!

Бюро ЦК надае асабліва важнае, першараднае значэнне пытанням, якія датычаць патрэб ветэранаў і асабліва інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны.

Іх скаргі і просьбы павінны знаходзіцца пад асабістым кантролем кіраўнікоў партыйных камітэтаў і выканкомаў Саветаў і побач з іншымі найбольш важнымі пісьмамі правярацца з абавязковым выездам адказных работнікаў на месцы. Ва ўсіх выпадках, якімі б гэтыя просьбы ўдзельнікаў вайны ні былі, павінны адшуквацца магчымасці для найбольш поўнага іх задавальнення. Іншага падыходу, у чым мы зусім упэўнены, няма і не можа быць.

Значнае месца ў пошце, якая паступае ў адрас ЦК, займаюць скаргі на парушэнні працоўнага заканадаўства — прыкладна 2,5 тысячы штогод. І калі ўлічыць, што большасць з гэтых сігналаў пацвярджаецца праверкамі, то стане ясным, з якой вострай праблемай мы сутыкаемся. Тут і адсутнасць належнага кантролю з боку адміністрацыйных і прафсаюзных органаў. Тут і няведанне некаторымі кіраўнікамі савецкіх законаў аб працы. Тут і абуральныя факты самаўпраўства і самавольства.

Аб якой, напрыклад, строгасці і патрабавальнасці з боку народных судоў і органаў пракуратуры можна гаварыць, калі з 93 тысяч рублёў, выплачаных у мінулым годзе незаконна звольненым за вымушаныя прагулы, толькі 5 тысяч спагнана з вінаватых службовых асоб.

веркі можна прыняць правільнае рашэнне, ліквідаваць недахопы і выправіць становішча. Але тады, калі няма належнай праверкі, страчваецца эфектыўнасць і сам сэнс работы з пісьмамі ў цэлым. Нічога агульнага з партыйным падыходам да гэтай справы не мае такая практыка, калі замест старанная вывучэння фактаў правяраючыя мірна пагутараць з кіраўніком і гэтым абмяжоўваюцца.

Па такому, самаму лёгкаму, але ў корані няправільнаму шляху пайшлі адказныя работнікі Міністэрства паліўнай прамысловасці, ажыццяўляючы праверку пісьма рабочых торфапрадпрыемства «Любашкінскае». У выніку, як на гэтым прадпрыемстве дапускаліся факты безгаспадарчасці і грубых адносін дырэктара да служыўцаў, аб чым пісалі рабочыя, так усё і засталося.

Як ацаніць палітычны ўрон ад такой праверкі?

Па-першае, рабочыя страцілі веру ў супрацоўнікаў міністэрства, у іх сумленнасць і прынцыповасць. Па-другое, дырэктар прадпрыемства яшчэ больш паверыў у сваю бязгрэшнасць і беспакаранасць. І, па-трэцяе, нараджаюцца новыя шматлікія скаргі, таму што людзі не могуць змірыцца з недахопамі.

У гэтай сувязі некалькі слоў аб паўторных пісьмах. Чалавек часам звяртаецца ў першую, у другую, трэцюю, дзесятую інстанцыю, а яго прапанова або просьба не знаходзяць падтрымкі, належнага растлумачэння, або законнага вырашэння. Так было, у прыватнасці, з жыхаром г. Брэста т. Царуком В. І., які пасля шматлікіх, але безвыніковых зваротаў у мясцовыя органы прыслаў скаргу ў ЦК КПБ. І толькі пасля гэтага тымі ж мясцовымі органамі пытанне было вырашана станоўча. Наконт гэтага т. Царук В. І. напісаў у ЦК КПБ на імя тав. Машэрава П. М. наступнае: «Вельмі прыемна, што ў Вас, Пётр Міронавіч, знаходзіцца час для такіх жыццёвых спраў. Бо ў Вас жа шмат клопатаў больш істотных, дзяржаўных. Было б лепш і Вам, і ўсім нам, калі б такія пытанні вырашаліся на месцах, не даходзячы да Вас».

Значную шкоду справе наносіць бытуючая яшчэ сям-там практыка дзялення пытанняў, якія ставяцца працоўнымі, на значныя і малазначныя, на буйныя і дробныя, на грамадскія і асабістыя. Думаецца, што такое дзяленне, праводзімае нават умоўна, не толькі няправільнае, але і шкоднае.

Хіба можам мы адносіцца як да дробязей да таго, што хоць

карэспандэнцыі, якая паступае ў Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, такога роду сігналы займаюць прыкладна 15 працэнтаў. А ў ліку пісьмаў, што паступаюць у камітэт народнага кантролю рэспублікі, іх доля складае 40 працэнтаў.

Нярэдка прыходзіцца чуць галасы аб тым, што нам, маўляў, не трэба наогул займацца ананімкамі, дарэмна траціць час. Мы лічым, што гэта памылковая пазіцыя. Вельмі ў многіх пісьмах без подпісу выкладаюцца факты, якія потым, пры праверцы поўнасцю або часткова пацвярджаюцца. І ў гэтым іх каштоўнасць.

Нам не важна, падпісана заява або не. Мы зацікаўлены перш за ўсё ў тым, каб мець як мага больш звестак аб недахопах і промахах, дапускаемых у рабоце. Маем патрэбу мы ў гэтым таму, што кроўна зацікаўлены ў паляпшэнні гаспадарчай, культурнай, выхаваўчай і іншай работы. У гэтым нам дапамагае ўся паступаючая ад насельніцтва інфармацыя, у тым ліку і ананімная.

Вельмі моцна сказаў наконт гэтага таварыш Л. І. Брэжнеў на ўсесаюзнай нарадзе партыйных работнікаў. Не кожную ананімку, гаварыў ён, трэба выкідваць у кошык. Па тых або іншых меркаваннях часам чалавек можа і не падпісаць заявы, але нейкае жаданне павядаміць аб парушэннях партыйнай або дзяржаўнай дысцыпліны тым або іншым работнікам мае. А гэта вельмі важна.

Мы толькі тады зможам грэбаваць ананімнымі паведамленнямі, калі ў нас усюды будзе выключана магчымасць помсціць аўтарам і праследаваць іх за крытыку. Такія дзеянні караюцца і па нашых дзяржаўных, і па нашых партыйных законах. Але зацікаўленікі крытыкі ўсё яшчэ жывучыя. Абавязак наш — да кожнага з выяўленых такіх фактаў падыходзіць з усёй суровасцю. Людзей, якія дапускаюць зацісканне крытыкі, трэба ў адпаведнасці з канстытуцыяй прыцягваць да адказнасці і пазбаўляць кіруючых пасад, а ў адпаведнасці са Статутам КПСС караць аж да выключэння з партыі.

Напэўна будзе правільным у гэтай сувязі сказаць і аб розных паклёпніках, якія, кіруючыся нізкімі інтарэсамі, імкнуцца абганіць нашу работу, зняславіць нашы кадры. У гэтым выпадку таксама неабходна прымяняць і сілу грамадскага ўздзеяння, і сілу закона.

Нам вядомы не адзінкавыя факты, калі ў разуменні і ў падыходзе да ананімных сігналаў на практыцы дапускаюцца памылкі. Толькі ў сілу таго, што пісьмо нікім не падпісана, яно правяраецца дрэнна або не правяраецца наогул. У дакументах па іх спісанню лака-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы